ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
7
сакавіка
ЧАЦВЕР
№ 8 (148)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ
## ТЭЛЕТАЙП
•УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА•

### На чарговым пасяджэнні

эро парткома ішла размова аб рабоце навукова-даследчых інстытутаў, СКТБ з ВВ, галіновых і праблемных лабараторый універсітэта па ўдасканаленню вучэбнага працэсу і павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Абмеркавана таксама дзейнасць калектыву кафедры фізічнай культуры і спорту па развіццю масавага спорту, арганізацыі спаборніцтваў і правядзенню аздараўленчых мерапрыемстваў.

Разгледжана работа партыйнага бюро і дэканата юрыдычнага факультэта па павышэнню ролі вучэбнай групы ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

### Надзённыя пытанні

работы калектыву універсітэта па месцы жыхарства былі абмеркаваны на пасяджэнні партыйна-гаспадарчага актыву мікрараёна. Звернута ўвага на неабходнасць узмацнення прапагандысцкай, агітацыйнай, культурна-масавай і спартыўнай работы да 40-годдзя Перамогі.

З. МІХНЕВІЧ.

### Стан работы

камітэтаў камсамола механіка-матэматычнага і юрыдычнага факультэтаў па выкананню сумесных планаў з зямляцтвамі і арганізацыімі замежных студэнтаў быў разгледжаны на пасяджэнні бюро камітэта камсамола. Заслухана інфармацыя аб выніках праверкі стану нагляднай агітацыі ў камітэтах камсамола факультэтаў і ход выканання пастановы бюро ЦК ЛКСМБ «Аб рабоце камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна па выкананню рашэнняў XIX з'езда ВЛКСМ».

А. СЛАНЕЎСКІ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.

### Адбылася

вучоба рэдактараў насценных газет факультэтаў. Аб вопыце работы насценнай газеты «Журналіст» расказала член рэдкалегіі І. Кашыцкая. Быў зроблены агляд друку, дадзены парады рэдактарам.

С. БАЛЦЭВІЧ,
член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта.

## Са святам вас, дарагія жанчыны!




РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

## ВУЧОБА — ГЭТА ТВОРЧАСЦЬ

— МОЙ САМЫ ЛЮБІМЫ занятак — вучоба,— словы, якія сказала студэнтка 4-га курса аддзялення палітэканоміі, ленінскі стыпендыят Алена Цітова, не здзіўляюць, бо ўсе, хто ведае студэнтку, адзначаюць яе карпатлівую працу.

Лена прызналася, што вучыцца ёй дапамагаюць мэтанакіраванасць і працавітасць. Стаць добрым спецыялістам — галоўная яе мэта.

Да паступлення ва універсітэт Лена Цітова мела двухгадовы стаж работы. Яна паступіла, маючы пэўны жыццёвы вопыт, сфарміраваны характар — дапытлівы, прынцыповы. І з першых дзён вучобы ўзялася за працу, не адкладваючы нічога на потым.

— Палітычную эканомію выбрала невыпадкова,— гаворыць студэнтка.— Люблю за тое, што прымушае думаць, самой прымаць рашэнні. Як і матэматыка, якую я таксама люблю. А калі добра ведаеш прадмет — можна тварыць, так, тварыць, як у мастацтве.

А яшчэ яна піша вершы. У іх дзяўчына імкнецца адлюстраваць складаныя з'явы жыцця, адносіны паміж аднакурснікамі.

Нядаўна студэнтку выбралі старшынёй савета выдатнікаў факультэта. Клопатаў прыбавілася. Акрамя традыцыйнай работы савет пачаў праводзіць новыя мерапрыемствы. Хутка будзе арганізавана сустрэча студэнтаў гістфака з вучонымі Акадэміі навук БССР, рыхтуецца атэістычны вечар.

Як адзначыла Лена, сяброў у яе нямнога. Яна любіць надзейных, выпрабаваных таварышаў. Але аўтарытэт дзяўчыны на курсе вялікі.

Кім будзе сённяшняя студэнтка пасля заканчэння універсітэта? Лена задумалася над гэтым пытаннем і адказала:

— У кожнага ёсць свая мара. Яе ажыццяўленне залежыць ад самога сябе. Але галоўнае — патрэбна заўсёды быць добрым чалавекам, з адказнасцю падыходзіць да даручанай справы.

І. УЛАДЗІМІРАЎ.

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

## МОВА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

У САВЕЦКІ САЮЗ гэтыя юнакі і дзяўчаты з ФРГ прыехалі, каб сваімі вачыма ўбачыць праўду. Мэта ж паездкі — глыбей вывучыць рускую мову, бліжэй пазнаёміцца з культурай Краіны Саветаў.

Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік» штогод арганізоўвае на базе філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна месячныя курсы рускай мовы для студэнтаў з капіталістычных краін. Італьянцы і фіны, немцы і канадцы, амерыканцы з'яўляюцца іх слухачамі. У групе, пра якую ідзе гаворка, было больш як дваццаць чалавек.

Да абеду яны займаліся на курсах. А пасля «Спадарожнік» рабіў усё для таго, каб знаёмства з Беларуссю праходзіла як мага лепш. У гэтым дапамагалі і мы, студэнты, байцы ідэалагічнага атрада, створанага камітэтам камсамола універсітэта.

— Колькі каштуюць кватэры?

— Што азначае школьная рэформа?

— Ці праўда, што навучанне ў вышэйшых установах у вас бясплатнае?

— Дзе жывуць іншагароднія студэнты?

— Якая самая прэстыжная спецыяльнасць у Саюзе?

Пытанні... Пытанні... Толькі паспявай адказваць.

У сваю чаргу і мы цікавімся жыццём у ФРГ. Грошы... Яны пануюць там сёння над людзьмі. Амаль за кожны крок прыходзіцца плаціць. Таму гасцям было так цяжка зразумець, чаму адмовіўся ад грошай служачы атракцыёна, які, даведаўшыся, што з намі нямецкая група, згадзіўся пакатаць усіх пасля працоўнага дня. І зусім непрывычнай была для іх бясплатная медыцынская дапамога, якую аказалі нашы ўрачы аднаму з юнакоў.

Мы стаялі на плошчы Перамогі. Шчаслівыя маладажоны клалі букеты кветак да Вечнага агню. І раптам хтосьці з групы спытаў: «А чаму ў вас так многа помнікаў?». Ніхто не адказаў тады. Але потым, пасля гэтай паездкі, той хлопец зразумеў многае.

«Ікарус» імчаў па шашы Мінск — Віцебск. Ззяла сонейка. Але як толькі наблізіліся да мемарыяла, надвор'е рэзка змянілася. Неба зацягнулася хмарамі — пайшоў дождж. Выйшлі з аўтобуса. Парасонаў на ўсіх не хапала, але ніхто не вярнуўся ў машыну. Экскурсавод гаварыла пра кожнага чацвёртага, загінуўшага ад рук фашыстаў на беларускай зямлі. Гарэў Вечны агонь. Побач зелянелі тры бярозкі. Яны жывуць, як жывём і мы — трое з чатырох. Пад адным парасонам стаялі нямецкая дзяўчына і я. Заўсёды вясёлая прыгажуня Гепа задуменна глядзела на полымя агню памяці.

— Мне вельмі балюча за ўсё гэта,— скажа яна потым.— Такое не павінна паўтарыцца. За мір трэба змагацца.

Так думала не толькі васемнаццацігадовая Гепа. У маім блакноце і сёння захоўваецца ліст, які напісала таксама дзяўчына з ФРГ. Пазнаёмілася я з ёй у інтэрклубе. Яна прыехала з іншымі турыстамі сваёй краіны. Адзіны чалавек з групы, які трохі гаварыў па-руску, быў нарасхват. Таму прыйшлося абыходзіцца сваімі ведамі нямецкай і англійскай моў. Мы думалі, што бачымся першы і апошні раз. Але на наступны дзень зноў сустрэліся.

Сёння наведалі Хатынь. Тое, што некалі там адбылося,— гэта жах.

Мы яшчэ доўга размаўлялі. Пры развітанні дваццацігадовая Біргет працягнула мне ліст. І хоць напісаны ён быў па-нямецку, я зразумела ўсё без слоўніка. «Наташа,— пачыналася пісьмо,— многія немцы, у тым ліку і я, жадаем міру для ўсіх людзей свету. Міру без мілітарызацыі, бомб і ракет. Зброя павінна быць знішчана. Трапіўшы ў Савецкі Саюз, я ўбачыла, што вы, усе рускія, таксама змагаецеся за мір...»

Назад ехалі моўчкі. Зноў выглянула сонейка, за вокнамі мільгалі бярозкі. Жыццё працягваецца. Яно не павінна абарвацца ні для нас, беларусаў, ні для іх, немцаў.

Аўтобус збавіў хуткасць. Прыродны ландшафт змяніўся каскадам сучасных шматпавярховых дамоў мікрараёна «Зялёны Луг». Я прыслухалася да слоў Рольфа — выкладчыка рускай мовы, які дзяліўся ўражаннямі. І зразумела: нашы госці самі ўсё ўбачылі. І адчулі галоўнае — упэўненасць кожнага савецкага чалавека ў заўтрашнім дні.

— Я не хачу вяртацца дадому,— скажа на вакзале студэнтка з Франкфурта-на-Майне Хрысціян,— бо не ведаю, што мяне там чакае.

Не ведалі гэтага і іншыя яе землякі.

Н. КУРБАЦКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

КАЛІ ЖЫЦЬ ШЧОДРА

# «ЛЮБЛЮ СВОЙ КРАЙ...»

На адной з рэдакцыйных «лятучак» вырашылі на старонках шматтыражкі перыядычна даваць слова выкладчыкам, лекцыі якіх лічацца найбольш змястоўнымі, цікавымі, праблемнымі. Умоўна серыю публікацый было прапанавана назваць прыкладна так: «Выкладчык і аўдыторыя: кантакт — творчы». Арганізоўваць і рыхтаваць да друку матэрыялы даручылі мне.

На геаграфічным факультэце дэкан Расціслаў Афанасьевіч Жмойдзяк сярод іншых кандыдатур назваў прозвішча М. В. Лаўрыновіч. Не адкладваючы, адразу пазваніла Марыі Віктараўне дамоў.

**— Прабачце, калі ласка, ваша ідэя добрая, і мне прыемна, што спыніліся на маёй кандыдатуры. Але, на жаль, прыняць вашу прапанову не магу. Вельмі занята. Хіба толькі пазней, праз які месяц. Яшчэ раз прабачце.**

На гэтым наша «тэлефоннае» знаёмства закончылася. Не ведала я, што давядзецца праз нейкі тыдзень-другі зноў сустрэцца з М. В. Лаўрыновіч, пісаць пра яе.

**...— Спачатку абавязкова прачытайце літаратуру наогул пра запаведнікі, а потым канкрэтна па вашай тэме,— упэўнена і спакойна гучыць голас Марыі Віктараўны.**

Седзячы побач, я назіраю, як даходліва і зразумела дае яна кансультацыю студэнтцы. І дзяўчына, якая толькі што зайшла на кафедру разгубленая і няўпэўненая, неяк адразу ажывілася, пачала падрабязна расказваць аб сваіх задумках наконт напісання работы. І тут ужо ў сваю чаргу ўважліва, не перабіваючы, слухала яе выкладчыца.

Нейкая непадробная шчырасць, гатоўнасць прыйсці на дапамогу, улюбёнасць у сваю справу — усё гэта ўразіла мяне з першых хвілін нашага знаёмства з М. В. Лаўрыновіч.

Яна нібы зачаравала мяне: сваімі прыгожымі блакітнымі вачыма, сваёй абаяльнасцю, прыемным голасам, расказамі аб прыродзе, аб жывапісных мясцінах Палесся, Кольскага паўвострава, Сярэдняй Азіі, аб экзатычным ландшафце Індыі.

**— Я была ў Балгарыі, Югаславіі, Францыі,— гаворыць Марыя Віктараўна.— Бачыла там цудоўную прыроду. І ўсё ж кожны раз, калі вярталася дамоў, трапляла ў бярозавы гай, сэрца напаўнялася бязмернай любоўю да родных мясцін. Згадзіцеся, кожны куточак прыроды па-свойму непаўторны, калі на яго глядзець неабыякава. Есць нешта чароўнае ў гэтай ціхай, маляўнічай прыгажосці. Напэўна, у кожнага з нас, географаў, ёсць бадай што «вечная» мара: больш падарожнічаць і больш убачыць.**

Студэнты прыгадвалі, з якім захапленнем пасля кожнай такой паездкі М. В. Лаўрыновіч расказвала ім пра маршрут падарожжа, жывёльны і раслінны свет мясцін, дзе пабывала, дзялілася незабыўнымі ўражаннямі. Яна памятае, як слухалі расказы (не прачытаныя ў кнізе) пра прыроду яны, студэнты пяцідзесятых. Памятае і свае першыя лекцыі, калі акрамя матэрыялу, засвоенага з літаратуры па геаграфіі, мала што магла дадаць, бо маршрут падарожжаў быў зусім сціплым. Але Марыя Віктараўна старалася. Яна прывыкла працаваць яшчэ ў школе (у атэстаце сталасці былі ўсяго дзве чацвёркі). І гэта пацвердзіла яе вучоба на геаграфічным факультэце нашага універсітэта, які яна закончыла ў 1958 годзе і атрымала дыплом з адзнакай. Была размеркавана ў Інстытут глебазнаўства. Але толькі два гады працавала там інжынерам-глебазнаўцам. А потым паступіла ў аспірантуру і засталася на кафедры фізічнай геаграфіі зарубежных краін (потым кафедра фізічнай геаграфіі мацерыкоў і акіянаў).

У гэты час Марыя Віктараўна плённа працавала над тэмай кандыдацкай дысертацыі. Дарэчы, тэма «Азёры беларускага Палесся» у студэнцкія гады была тэмай навуковай работы, якой М. В. Лаўрыновіч аддавала шмат сіл і часу.

**— Працоўны лёс у мяне склаўся вельмі ўдала,— разважае Марыя Віктараўна.— Мне пашанцавала, што побач са мной былі такія цудоўныя людзі, як прафесар Вольга Піліпаўна Якушка, мой навуковы кіраўнік, у якой я вучылася самастойна працаваць, творча думаць, сур'ёзна адносіцца да справы, і прафесар Віктар Рыгоравіч Заўрыеў. Я пачынала сваю працоўную дзейнасць пад яго непасрэдным кіраўніцтвам. І ўвесь час мы, маладыя, адчувалі яго пільны клопат пра нас. Мне, тады зусім маладой выкладчыцы, даручылі чытаць лекцыйны курс «Фізічная геаграфія мацерыкоў», дарэчы, адзін з асноўных курсаў на факультэце.**

**— Ведаеце,— працягвае М. В. Лаўрыновіч,— я вельмі разгубілася. Адразу ўзнікла безліч пытанняў. І галоўнае сярод іх: ці дастаткова ў мяне ведаў, каб пайсці да студэнтаў? Разумела, што матэрыялу з падручнікаў малавата. Але Віктар Рыгоравіч дапамагаў падбіраць літаратуру, раіў, на якім пытанні акцэнтаваць увагу, а ў чым даць студэнтам магчымасць разабрацца самім. Ен часта наведваў лекцыі, запрашаў мяне на свае...**

З таго часу прайшло больш за дваццаць гадоў. Але кожны раз, калі ідзе ў аўдыторыю, Марыя Віктараўна ўсё роўна хвалюецца і, на яе думку, магчыма, больш, чым раней. Толькі тады, дваццаць гадоў назад, яна не магла дачакацца, калі празвініць званок, а зараз наадварот: акадэмічныя гадзіны здаюцца вельмі кароткімі. І заўсёды даводзіцца нечым ахвяраваць, пра нешта расказаць менш, чым хацелася б. Але ёсць магчымасць прадоўжыць гутарку на семінарскіх занятках. І разам праверыць, як студэнты засвойваюць матэрыял.

Сёння перад кожным з нас стаіць важная і складаная задача — ахова навакольнага асяроддзя. Асабліва гэта датычыцца вучоных-географаў. Яны павінны кожнаму студэнту — свайму вучню — прывіць любоў да прыроды, каб яны захоўвалі яе, рабілі ўсё, каб зберагчы гэты дар для нашчадкаў. На лекцыях, семінарах Марыя Віктараўна імкнецца больш падрабязна знаёміць сваіх вучняў з асноўнымі напрамкамі геаграфічнай навукі, з новымі тэорыямі і гіпотэзамі, палажэннямі, якія павінны прымацца як кіраўніцтва да дзеяння. Выкладчыца стараецца даць матэрыялу больш, бо падручнікаў па гэтаму курсу не хапае. Гэты прагал крыху запоўнілі вучоныя кафедры. У наступным годзе ў выдавецтве «Вышэйшая школа» выйдзе «Фізічная геаграфія мацерыкоў» (першая частка, Еўразія) — падручнік для дзяржаўных універсітэтаў. Сярод яго аўтараў — М. В. Лаўрыновіч.

**— Зараз мы атрымалі з выдавецтва водгук і заўвагі, якія неабходна тэрмінова рэалізаваць,— расказвае Марыя Віктараўна.— Нам таксама хочацца, каб падручнік выйшаў хутчэй. Ен вельмі дапаможа студэнтам. Ім не патрэбна будзе траціць час на пошук адказаў на экзаменацыйныя білеты ў розных падручніках. А прыкладна праз год выйдзе і другая частка «Фізічнай геаграфіі мацерыкоў», якая таксама падрыхтавана супрацоўнікамі нашай кафедры.**

...Наша размова падыходзіла к канцу. Марыя Віктараўна спяшалася: хутка заняткі ў вячэрнікаў, а яшчэ патрэбна шмат паспець зрабіць. Мы развіталіся, і я задала Марыі Віктараўне пытанне, якое хацела задаць яшчэ ў пачатку сустрэчы: ці шчаслівая яна?

**— Так,— адказала Марыя Віктараўна,— шчаслівая. Я люблю сваю работу, свой родны край. Ці ж гэта не найвялікшае шчасце для чалавека?**

А потым дадала:

**— І напярэдадні 8 Сакавіка жадаю ўсім жанчынам здароўя, маладосці, радасці, каб яны плённа працавалі пад мірным небам!**

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

ФОТАРЭПАРТАЖ

# ДЗЯЎЧАТЫ

ФОТАРЭПАРТАЖ









*НА КАЛЕНДАРЫ — вясна. У сумках паштальёнаў цесна ад віншавальных паштовак. Усе яны адрасаваны цудоўнай палове чалавецтва — жанчынам. Дзесяткі, а можа і сотні з іх нясе пошта Галіне Ляўко, Марыі Краснік, Таццяне Кавеліч, Іне Дарашэвіч, Але Барахоўскай, Святлане Лебядзевіч і ўсім астатнім дзяўчатам трэцяй групы 3-га курса факультэта прыкладной матэматыкі нашага універсітэта.*

*Група... 21 чалавек. І ніводнага хлопца! Так і хочацца спытаць: як жывецца без хлопцаў? Не сумна? Не адзінока? Асабліва зараз, напярэдадні Міжнароднага жаночага дня. А ў адказ мілыя ўсмешкі і ніводнага слова...*

*Свайго адзінага хлопца група паўтара года назад дружна праводзіла на службу ў рады Савецкай Арміі.*

*Група, пра якую ідзе размова, не лічыцца на факультэце самай-самай. Увогуле група як група. Зімовую сесію здалі без запазычанасцей, з боку дэканата заўваг няма. Амаль кожная дзяўчына выконвае грамадскае даручэнне. І самае галоўнае—ёсць у трэцяй групы трэцяга курса свой твар. Яго можна вызначыць адным словам — вясёлая.*

*Цяжка бывае да сур'ёзнай справы падабраць бадзёры настрой. І тут на выручку прыходзіць камсорг Галіна Ляўко. Ні адно мерапрыемства ў групе не абыходзіцца без Галі. Спрачаецца, даказвае, пераконвае. Заўсёды, за любую справу бярэцца першай. І за гэта яе паважаюць, да яе звяртаюцца за дапамогай, за парадай.*

*— Неяк прачытала ў газеце (пісаў наш равеснік), што сучаснай моладзі няма дзе правесці вольны час. Сумна, маўляў,— расказвае Марыя Птуха.— Нават смешна. Проста многія не ўмеюць арганізаваць свой адпачынак.*

*— Мы не сумуем. Самі ствараем сабе настрой. Ходзім усёй*

ВЕТЭРАНЫ Ў СТРАІ

# ДРЭВЫ ЖЫЦЦЯ

ВІДАЦЬ, надта прадбачлівы той чалавек, які пасадзіў першае дрэва. І зусім не памыліліся людзі, калі сталі лічыць, што жыццё пражывеш нездарма, калі вырасціш хаця б адно дрэва. Колькі дрэў пасадзіла на сваім вяку Я. Л. Прыбыткова, сказаць цяжка. Вайна пакінула мінчанам груды развалін. Патрэбна было ўздымаць горад і саджаць дрэвы. Асабліва дарагі ёй парк імя Я. Купалы. Балюча робіцца ад кожнай зламанай галінкі. Далёкім водгуллем адгукаецца вайна...

Летам 1941 Яніна Прыбыткова паехала важатай у піянерскі лагер на станцыю Талька. Было цікава, весела. Дзеці неяк па-свойму ўмеюць радавацца святлу, прыродзе, жыццю, а разам з імі радавалася і Яніна, яшчэ сама амаль што дзяўчынка.

Раніца таго дня была такая ж сонечная, з такой жа буйной расою, ды толькі над зямлёю плылі ўжо чорныя хмары. Вайна. У галаву лезлі самыя розныя думкі: як быць, што рабіць? Але Яня не магла нават уявіць сабе, што яна зможа кінуць дзяцей. Трыста пяцьдзесят хлопчыкаў і дзяўчынак, трыста пяцьдзесят маленькіх чалавечкаў поўнымі адчаю вачыма глядзелі на дарослых людзей. Сяляне з суседняй вёскі злавілі нямецкага дэсантніка. На карце, знойдзенай у яго, была і вёска, і піянерскі лагер, акрэслены, як ваенны аб'ект. Было страшна, было вельмі страшна Яніне і яе сяброўкам. Не за сябе — за дзяцей. Баяліся, што ў любы момант варожы снарад прынясе смерць.

Праз некалькі дзён пачалі збірацца ў дарогу. Дзецям аддзелі самае лепшае аддзенне, забралі апошнюю скрыню сахару і кавалак масла. Дзеці засталіся ў лесе, крыху не даходзячы да чыгуначнай станцыі. Яня і яшчэ некалькі дзяўчат убачылі дзяжурнага. Ён, некалькі начэй запар не спаўшы, папрасіў дзяўчат пасядзець ля тэлефона. А сам тут жа на лаўцы прылёг. У гэты час пазванілі і паведамілі, што ідзе спецыяльны поезд з параненымі. Просьба яго не спыняць. Дзяўчаты разбудзілі дзяжурнага. Яны прасілі, патрабавалі спыніць поезд, хаця і самі добра разумелі, што ён не мае на гэта права.

А поезд набліжаўся. Яго грукатанне было чутно здалёк. Дзяўчаты, страціўшы надзею спыніць, з панурымі галовамі чакалі яго. Вось і поезд. Набліжаючыся да станцыі, ён збавіў хуткасць. Усе кінуліся хутчэй да яго. Дабраліся да Магілёва. Тут адвялі пакой, накармілі. Праз некалькі дзён — зноў у дарогу. Відаць, наперадзе перадавалі, што ідзе поезд з дзецьмі, бо на кожным прыпынку іх сустракалі: хто кошык з яйкамі прынясе, хто бульбы, хто хлеба. А калі дабраліся да Мічурынска, то там іх чакаў гарачы суп. Сем дзён вандравалі па дарогах вайны дзеці піянерскага лагера з Талькі...

Месца, дзе знаходзіўся дзіцячы дом, было за восем кіламетраў ад горада. Ніякай сувязі там не было, і таму дарослыя па чарзе хадзілі ў горад за свежымі навінамі. У той дзень, калі ў горад хадзіла Яніна, па радыё перадалі страшную навіну: здадзены Смаленск. Яніна ішла, не разбіраючы дарогі. Слёзы, нібы туманам, засцілалі яе вочы. На ўскрайку лесу прыпынілася, не маючы сілы ісці далей. І плакала, плакала. Усёй душой хацелася на фронт, біць ворага.

Толькі з дзевятага разу яе просьбу задаволілі: прынялі ў школу малодшых спецыялістаў. Тут дзевяцьсот дзяўчат, яе аднагодак, авалодвалі ваеннымі прафесіямі.

Яніна Прыбыткова апынулася ў дэсантным батальёне...

— Вы мяне выпіхніце, прашу вас,— угаворвала дзяўчына лётчыка яшчэ на зямлі.

За гулам матораў голас чалавека ледзь можна было пачуць. Але тое, што паступіла каманда «Пайшоў», Яніна зразумела добра. Падрыхтавалася і глянула ўніз. Паветраная бездань. Рука сама нібы зраслася з ручкай.

— Не, не буду.

Каманда паўтарылася.

— Не магу. Але ж там, унізе, чакаюць. Гэта ж сорам.

— Пайшоў!

І ўсё ж яна прыгнула. Яна перамагла сябе...

Перамога над ворагам была атрымана, і яна вучылася, праўда, не ў Маскоўскім чыгуначным, як марыла з дзяцінства, а ў Мінскім педагагічным інстытуце. Будавала, упрыгожвала Мінск. Доўгі час Яніна Лявонцьеўна Прыбыткова была на камсамольскай рабоце, а зараз працуе на гістарычным факультэце нашага універсітэта. Яна па-ранейшаму з моладдзю.

— Я і газеты, і часопісы маладзёжныя чытаю. І няхай сівізна пакрывае галаву, усё ж старасці я не адчуваю.

...За марознаю зімою прыйдзе вясна. Па жылах дрэў зноў запульсуюць жывыя сокі. Зашуміць маладое лісце. У парку будуць гуляць дзеці. Моцна пусцілі карэнне дрэвы, пасаджаныя Я. Л. Прыбытковай.

**А. МАТУСЕВІЧ,**
**наш кар.**

З НАШАЙ ПОШТЫ

# ПА ЗАКОНАХ ДОБРАГА НАСТРОЮ

**Вам падабаецца наведваць пункты грамадскага харчавання? Незалежна ад адказу вы іх наведваеце. Бо кожны студэнт у сярэднім раз у дзень заходзіць у сталовую. Але з якім настроем?**

**— З добрым,— уголас адкажуць тыя, хто абедае ў сталовай галоўнага корпуса.**

**— Не вельмі,— у скрусе ўздыхнуць хімфакаўцы.**

**— З выдатным,— заявяць будучыя журналісты.**

УСЕ АДКАЗЫ не пазбаўлены рацыі. Справядлівасці дзеля адзначым, што з такім жа прыўзнятым настроем студэнты журфака выходзяць са сталовай. Што яшчэ больш немалаважна. Бо справа не толькі ў тым, чым накормяць, а і як накормяць. Нават адмыслова прыгатаваны боршч, проста выдатны па сваіх якасцях, не акупіць страчанага настрою.

Гэтага не здараецца ў работнікаў філіяла сталовай № 108, які размясціўся ў корпусе Інстытута народнай гаспадаркі, што на вуліцы Свярдлова. У гэтым жа будынку займаюцца і студэнты факультэта журналістыкі.

**— Калектыў падабраўся ў нас на дзіва дружны,— расказвае загадчык вытворчасці Іна Дзенісевіч. — Гэта крыху тлумачыцца тым, што работнікі — розных узростаў. І таму ў аснове адносін моладзі да сталых майстроў ляжыць звычайная чалавечая павага. На што першыя адказваюць такой жа прыхільнасцю, гатоўнасцю дапамагчы, падзяліцца ўсім тым, што ўмеюць самі.**

І на самай справе. Узяць, напрыклад, С. Д. Магілёўцаву, цётку Соню, як завуць яе тыя, хто ў сталовай працуе нядаўна. І не ўзрост таму прычынай, а яе шчырасць, уважлівыя адносіны да пачынаючых кухараў. Колькі дзяўчат вучылася ў яе майстэрству гатаваць! Не проста так, а з душой, каб заўсёды, пакаштаваўшы адмысловай кухні, наведвальнікі казалі: «Вялікае вам дзякуй!».

А словы шчырай падзякі часта адрасуюцца і такім выдатным кухарам, як А. П. Рыс, Раіса Траскоўская. У іх ёсць чаму павучыцца практыкантам кулінарнага вучылішча Віктару Нікіціну і Ігару Жуку. І не толькі ўменню добра гатаваць, а перш за ўсё ветлівым адносінам да наведвальнікаў. Дарэчы, культура працы — клопат не апошняй важнасці для работнікаў сталовай. Заключаецца гэта не толькі ў стэрыльнай чысціні посуду, парадку ў памяшканнях і сурвэтках на сталах. Шчырая ўсмешка, з якой сустракаюць тут кожнага наведвальніка, сведчыць аб тым, што ён — жаданы госць.

**А. ПАДАЛКА.**







*групай у кіно, тэатры, на дыскатэкі. Разам весялей сустракаць святы, лягчэй пераадольваць цяжкасці і непрыемнасці. Разам зручней рыхтавацца да залікаў і экзаменаў.*

*Мне раптам захацелася спытаць у іх, якім яны ўяўляюць сучаснага мужчыну? Дзяўчаты адказвалі шумна, спрачаючыся між сабой, але вобраз атрымліваўся ясны, дакладны:*

*— Сучасны мужчына павінен валодаць наступнымі якасцямі: па-першае, і абавязкова — розум. Вясёлы. Смеласць і сіла. Воля і стойкасць. Інтэлігентнасць, уменне трымаць сябе ў любых жыццёвых сітуацыях. Гэта, вядома, не тое паказное, што напускаюць на сябе часам сучасныя хлопцы. Ласкавы, добры, сціплы, акуратны. Мужчына — не мужчына без сапраўднай справы, сур'ёзнай, захапляючай работы. Юнак, які валодае ўсімі гэтымі якасцямі, ужо прыгожы. Ну, а знешняя прывабнасць зробіць яго проста марай любой дзяўчыны,— падвяла рысу Іна Дарашэвіч.*

*— А якой жа павінна быць сучасная дзяўчына? — спытаў я на развітанне.*

*— Як мы!..— дружна адказала група.*

**А. ВАЛОШЫН.**

***НА ЗДЫМКАХ:***
***Комсорг Галіна Ляўко;***
***Ала Бараҳоўская і Света Лебядзевіч: «Тут жа так проста!»;***
***Марыя Птуха і Люда Герасімчук за лабараторнай работай;***
***камсорг Галіна Ляўко (злева) і група вырашылі: 8 Сакавіка святкуем разам;***
***вучоба — галоўная праца студэнтак;***
***сяброўцы — па сакрэту (Ала Гінько і Света Грыневіч);***
***успамін аб будатрадзе — планы на лета-85;***
***бывай, зіма!***

*Фота аўтара.*

# ЯК САМА ВЯСНА!

**ДЗІЎНЫЯ РЭЧЫ дзеюцца вясной. Асабліва на яе восьмы дзень адбываюцца падзеі, якія не тлумачацца законамі логікі.**

**Так, кветкі ў руках мужчыны зусім не сведчаць, што ідзе ён не дадому. А калі ў трамвай зойдзе жанчына, па меншай меры паўтузіна галантных рыцараў прапануюць ёй сваё месца. Быццам перастаў выходзіць «Физкультурник Белоруссии» ці «Советский спорт»...**

**Адзін дзень з 365, калі ўсё падпарадкавана законам жаночай логікі, пабудаванай на алагічнасці. Настольні, што выключна большасць мужчынскага насельніцтва замест футбольнага матча з удзелам мінскага «Дынама» глядзіць на кухні, каб не падгарэў святочны пірог...**

**Ты раптам бачыш, што ў тваёй групе (на курсе, кафедры, у лабараторыі) ёсць (о цуд!) сапраўдныя жанчыны: прыгожыя і стройныя, абаяльныя і па-жаночаму пяшчотныя. І так хочацца да ног кінуць усе кветкі камароўскага рынка ў закрычаць на увесь свет: «Вы цудоўныя, як сама вясна!» Таму што сёння асаблівы дзень. Сёння — 8 Сакавіка!**

**Адміністрацыя Лірычна-Іранічнага ФакультэТа дорыць Вам, дарагія жанчыны, разам з усімі кветкамі планеты свае ўсмешкі!**

**Дзяжурны па ЛІФТу.**




# УРОК ЛОГІКІ

ШТО ТАКОЕ логіка, ведаюць усе. У падручніках пра гэта напісана даволі зразумелаю моваю. Аднак аглядзімся наўкол. На сябе паглядзім. І ўжо нам не зусім зразумела. Бо мы самі часам робім учынкі, якія пазбаўлены ўсялякай логікі.

Прыкладам можа паслужыць мая гісторыя з дзяўчынай М. Мы ніколі не былі з ёю ў адной кампаніі, ніхто нас не знаёміў, не было выпадку, каб мы размаўлялі. І тым не менш пры сустрэчы мы віталіся лёгкім кіўком галавы. І добразычліва ўсміхаліся.

Некаторы час я над гэтым не задумваўся. Але аднойчы мы, сустрэўшыся, пачціва павіталіся і ўсміхнуліся адзін аднаму. У мяне ў галаве нарадзіўся рой думак і сумненняў. Хто, уласна кажучы, гэтая М.? Як яе імя і дзе жыве, чым займаецца? І дзе мы з ёй сустракаліся: у прафесарскай, на спаборніцтвах, у кіно ці на пляжы? Не мог прыгадаць.

Аднак выдатна запомнілася мне наша апошняя сустрэча на трамвайным прыпынку. Як заўсёды, са шчырай усмешкай мы прывіталіся. Яна зайшла ў пярэднія дзверы, я — у заднія. Сеў на свабоднае месца і не паспеў разгарнуць «Вячорку», як пачуў над самым вухам прыемны дзявочы голас:

— Ваш талон!

Звыкла сунуў руку ў кішэнь і ледзь не самлеў: забыўся пракампасціраваць. З вінаватай усмешкай на твары я зірнуў на кантралёра. Гэта была яна — М.! Вы думаеце, адбыўся трыумф закона логікі?..

З таго часу я болей з М. не вітаюся. Лічу, што пасля ўплаты двух рублёў штрафу гэта лагічна.

# СУР'ЁЗНЫЯ ЛЮДЗІ

**ГАЛІНКА, дачка дырэктара рэстарана «Вярба», сказала ў час апошняга спаткання:**

**— Ведаеш, Серж, бацькі сказалі, каб ты прыйшоў да нас пазнаёміцца. А інакш мне не будуць дазваляць гуляць пасля апоўначы. Прыходзь у нядзелю, будзе торт «Напалеон». Сама спяку. І прашу цябе, паспрабуй спадабацца бацькам, не пярэч, згаджайся ва ўсім.**

**Быў такі перыяд, калі адна стыпендыя ўжо патрачана, а да другой яшчэ далёка, і торт, прытым «Напалеон», зрабіў сваю справу. Я пайшоў. На званок адчыніў сам гаспадар.**

**— Ці не той гэта малады чалавек, што з маёй дачкою начамі бадзяецца?**

**— Як бадзяецца? Мы гуляем. Нават у парку. І ўвогуле...**

**— Ведаю гэтыя гулянкі. І чым яны заканчваюцца, таксама.**

**Гаспадар змераў мяне падазроным позіркам.**

**— Бач, які хлёсткі... Кнігамі захапляешся?**

**Прыгадаўшы Галінкіну параду, я тут жа заківаў галавою:**

**— Так, а як жа! Без памяці.**

**— Без памяці... Кнігі з розумам, з толкам любіць патрэбна. Гэта табе не каханая жанчына. Ну ўжо добра, пайшлі ў кабінет, пакажу бібліятэку.**

**— Во, глядзі,— тыцнуў пальцам у паліцу светла-карычневых вокладак гаспадар.— Падабаецца?**

**— А як жа! Чэхаў — мой любімы аўтар.**

**— Які яшчэ Чэхаў? Я, прызнацца, іх не чытаў, але да колеру добра дапасаваліся. Бачыш — мэбля ў мяне пад «арэх». І дыван на падлозе ў тым жа тоне. І на сцяне. А ты — любімы аўтар!.. Ну пайшлі, трэба цябе маці паказаць.**

**Увайшлі на кухню.**

**— А сухі які! Ты выпадкова не хворы?**

**— Не, я нармальны.**

**— Можа не ясі зусім?**

**— Харчаванне не бяда.**

**— Пэўна, сядзіш на адной лапшы ад стыпендыі да стыпендыі. а туды ж — харчаванне... Ты чым хоць займацца будзеш, як дыплом атрымаеш?**

**— Вершы пісаць стану.**

**— І што з цябе за жаніх такі? Галіна — дзяўчына відная, разумная, а ён — вершыкі. Смехата!**

**— Чакай, бацька, патрэбна яго падсілкаваць...**

**Аднак я ўжо не слухаў, выбег у прыхожую. Апранаючы куртку, адчуў, што яна неяк пацяжэла. Памацаў. У капюшоне была палова «Напалеона», загорнутая ў паперу.**

**Любая, любая Галінка!..**

# НАША ДВАЦЦАЦЬ ПЯТАЯ

У ГРУПЕ навенькая. З завочнага перавялася. Дзіўная такая дзяўчына.

Загаворыш з ёй аб высокім прафесіяналізме нашых фігурыстак, а яна і вухам не стрыне. Усё вачэй ад выкладчыка не адрывае. Слухае.

Прыбег тут з дэканата прадстаўнік. Пяць чалавек патрэбна дрэвы саджаць. Пашкадавалі мы навенькую, ідзі, маўляў, на веснавым сонейку пагрэйся, свежым паветрам падыхай. А яна: «Не!». Бы адрэзала. І зноў усю ўвагу на выкладчыка.

Перад самым святам зноў прыемны сюрпрыз з дэканата: «Вас тут дваццаць пяць? Усе тэрмінова на чацвёрты паверх, у самую вялікую аўдыторыю. Лекцыя будзе аб неабходнасці ўмацоўваць вучэбную дысцыпліну».

Усе дваццаць чатыры — да дзвярэй. Толькі навенькая сядзіць, бы яе да лаўкі ланцугамі прыкавалі. У кніжку ўтаропілася.

Назаўтра — зноў праблема. Замест трэцяй пары — агульнафакультэцкі семінар «Хвіліна гадзіну беражэ». Мы кніжак у бібліятэцы набралі, у кіёску — свежых газет і часопісаў з красвордамі. А яна сядзіць сабе, ад канспекта галавы не паднімае.

Не вытрымаў тады куратар:

— Ты чаму сябе калектыву супрацьпастаўляеш? Ты чаму мерапрыемствы зрываеш? Па якому праву?

А яна:

— Па таму самаму, што ў законах запісана!

— Што ты маеш на ўвазе?— цікавіцца куратар.

— А тое, што кожны мае права на вучобу.

Так і сядзіць яна, дзівачка, усё грызе граніт навукі. У сталоўку адзін раз хадзіць, ды і то ў час вялікага перапынку.

Але самае горшае, што іншыя, гледзячы на яе, свае правы качаць пачалі.

# Вясёлы тэлетайп

* СЯМЁН ВУСАЎ стаў удзельнікам аўтапрабегу: два кіламетры бег за аўтобусам, у якім забыў свой парасон.

* У СТУДЭНТКІ біялагічнага факультэта Тамары К. пасля летняй сесіі з'явіўся «хвост».

* ЖЫХАРЫ вострава Праслен рэгіструюць шлюбы у дзень брыльянтавага вяселля.

* У ЧАРГОВЫ раз пацвердзілася перавага ў сіле і спрыце мужчын перад жанчынамі. Пры пасадцы ў аўтобус ім удалося заняць усе месцы.

* НОВАЕ — гэта даўно забытае старое. Гэтую ісціну праверыў на практыцы студэнт Л. Папруга, які знайшоў рубель у кішэні свайго старога пінжака.

# Адвечныя пытанні

* Калі з цябе выйдзе чалавек, каго ты будзеш любіць больш: яго ці сябе?

* Якіх памераў павінна быць сумленне, каб было цяжка яго згубіць?

* Як быць, калі прапаноўваюць і руку, і сэрца, толькі ў розных гарадах?

# Мудрасць у розніцу

* Чым горшы спявак, тым гучней і пажадана без перапынку павінны быць апладысменты.

* * *

* Выхаванне — спроба бацькоў пазбавіць дзяцей ад сваіх недахопаў.

* * *

* Пачніце гаварыць сваім сябрам праўду ў вочы — і столькі новага даведаецеся пра сябе.

* * *

* Калі ты апярэдзіў падзеі, цябе затрымаюць абставіны.

* * *

*Філасофскі пункт гледжання на рэчы дапамагае абыходзіцца без іх.

* * *

* У каханні страчваюць розум — у шлюбе заўважаюць страту.

* * *

* Калі выключэнне становіцца правілам, яно не дапускае ніякіх выключэнняў.

## АБЯЦАННІ

Жонцы:

Дапамагаць убіраць, мыць, набываць, гатаваць, выбіваць, выхоўваць...

Куратару:

Уносіць пасільны ўклад, слушныя прапановы, дух дзелавой актыўнасці, членскія ўзносы.

Сабе:

Не піць, не курыць, не спазняцца, не спяшацца, не маўчаць, не абяцаць.




На свята па ЛІФТу дзяжурыў В. Грамовіч, маляваў І. Савоценка.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2387. АТ 13174

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ